## НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

С.Я. Новікаў

# XI МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ» У МДЛУ

6 красавіка 2012 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму пры актыўнай дапамозе аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі праведзена XI міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць”.

Адкрываючы канферэнцыю, прарэктар універсітэта А.М. Гарлатаў зазначыў, што ў чарговай штогадовай сустрэчы ў сценах лінгвістычнай навучальнай установы бяруць удзел даследчыкі з Беларусі (Брэста, Гомеля, Магілёва, Мінска), Расіі (Арэнбурга, Масквы, Санкт-Пецярбурга) і Германіі (Берліна), што адзначае пэўную падтрымку закладзенай дзесяць гадоў таму традыцыі па правядзенні такіх сустрэч у МДЛУ. Удзел у навуковай канферэнцыі неабходны не толькі для авалодання новай даследчыцкай практыкай, з вопытам якой нас могуць пазнаёміць замежныя калегі, але і для вызначэння асноўных трэндаў сучасных навуковых даследаванняў, што дамінуюць у найноўшай айчыннай і замежнай ваенна-гістарычнай навуцы, і іх параўнання з напрамкамі ўласных навуковых пошукаў. У адрас удзельнікаў канферэнцыі прагучалі пажаданні ўдачы і поспехаў, а таксама былі выказаны трывалыя спадзяванні на тое, што ў ходзе сустрэчы ўдасца ўзбагаціць ніву айчыннай гістарычнай навукі новымі знаходкамі, цікавымі не толькі для шырокай навуковай грамадскасці, але і для цяперашняга студэнцтва.

Канферэнцыя працавала ў фармаце пленарных пасяджэнняў, на якіх прадугледжваўся разгляд шырокага спектра розных пытанняў. Цягам цэлага дня ішлі напружаныя і плённыя дыскусіі з удзелам як масцітых прафесіяналаў, так і пачынаючых даследчыкаў, аспірантаў і саіскальнікаў, хто атрымаў практычныя ўрокі ў сферы распрацоўкі праблем ваенна-гістарычнай навукі. Фактычна кожнае пленарнае пасяджэнне ўяўляла сабой самастойную міні-канферэнцыю, у цэнтры якой стаялі тэмы блізкага праблемнага поля. Першае праходзіла пад назвай “Ваенная гісторыя Беларусі: новыя канцэпцыі і падыходы”, у ходзе якога былі заслуханы навуковыя даклады айчынных і замежных даследчыкаў, у тым ліку: К. Янеке (Берлін), Ю.З. Кантар (Санкт-Пецярбург), У.В. Фядзюніна (Масква), С.Я. Новікава (Мінск), А.В. Шаркова (Мінск).

Прадстаўленыя навуковыя даклады і паведамленні паказалі, што па цяперашні час не згасае цікавасць айчынных і замежных гісторыкаў да падзей Вялікай Айчыннай вайны. У фокус выступлення нямецкага музеязнаўцы, былога дырэктара Германа-расійскага музея у Берліне-Карлхорсце К. Янеке трапіла новая канцэпцыя будучай экспазіцыі Беларускага музея

гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Аналізуючы праект музейнай экспазіцыі, намечанай у якасці асновы музея Перамогі ў Мінску, адкрыццё якога прызначана ў беларускай сталіцы на 2014 год, даследчыца выказвае свае прафесійныя меркаванні адносна таго, што пашырэнне ваеннай праблематыкі ў экспазіцыі новага музея магло б у яшчэ большай ступені садзейнічаць легітымізацыі нацынальнай самаідэнтычнасці і захаванню гэтага ўнікальнага феномена ў народнай памяці.

Расійская даследчыца Ю.З. Кантар на аснове выкарыстання матэрыялаў Цэнтральнага архіва ФСБ Расіі і шырокай базы гістарыяграфічных крыніц раскрыла характар дзейнасці нацысцкіх грамадзянскіх і ваенных структур рабавання мастацкіх каштоўнасцяў Расіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Галоўны вывад, да якога прыйшла даследчыца, заключаецца ў тым, што татальнае рабаванне айчыннай культурнай спадчыны, якая заставалася на акупаванай немцамі савецкай тэрыторыі, праводзілася сеткай "спецыяльных" арганізацый, падпарадкаваных розным ведамствам Трэцяга рэйха. .

У.В. Фядзюнін спыніўся на разглядзе баявых дзеянняў Заходняй асобнай ваеннай акругі ў Беларусі ў перыяд з 22 чэрвеня па 9 ліпеня 1941 г. На момант завяршэння Беларускай абарончай аперацыі з 44 дывізій даваеннага складу Заходняга фронту засталося толькі 16, з якіх толькі 8 захавалі ад 30 да 50 % баявога складу, тады як астатнія часці і злучэнні Чырвонай Арміі ўяўлялі сабой зводныя атрады ў некалькі соцень чалавек. Але і праціўнік панёс значныя страты, прычым у рэшце рэшт зразумеў, што хуткай і лёгкай перамогі на ўсходзе яму не дасягнуць.

Тэма баявых дзеянняў у Беларусі летам 1941 г. знайшла працяг у дакладзе С.Я. Новікава, які паказаў іх вынікі на аснове нямецкіх дакументальных крыніц. Аб важнасці такога разгляду тагачасных падзей сведчыць падыход аўтара, які практычна ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі актыўна выкарыстоўвае метад гістарыяграфічнай і крыніцазнаўчай кампаратывістыкі, пераконваючы чытацкую аўдыторыю ў тым, што аб'ектыўны паказ падзей, якія адбыліся ў Беларусі летам 1941 г., можна забяспечыць пры ўмове аналізу як айчынных, так і замежных дакументальных крыніц і фактаў.

У дакладзе А.В. Шаркова паказана карная палітыка СССР ў адносінах асоб, якія супрацоўнічалі з нямецкімі захопнікамі. На думку даследчыка, шматлікасць форм калабарацыянізму вымагала ад савецкіх улад дыферэнцыраванага падыходу ў справе пакаранняў за супрацоўніцтва з ворагам. Адказ на пытанне, у якіх вобразах жыхары Магілёўшчыны захоўвалі ў сваіх успамінах мясцовых калабарантаў, нямецкіх акупантаў і партызан, даў магілёўскі гісторык А.Р. Агееў. Аб лёсе маёнткаў Радзівілаў і Вітгенштэйнаў у час і пасля Вялікай Айчыннай вайны распавядала супрацоўніца Дзяржаўнага Эрмітажа Н.А. Сідарава (Санкт-Пецярбург).

Другое пленарнае пасяджэнне "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: некаторыя старонкі гісторыі" пачалося з дакладаў У.В. Здановіча (Брэст), І.М. Кузняцова (Мінск), Я.І. Бараноўскага (Мінск), Я.А. Грэбеня (Мінск), М.В. Стральца (Брэст).

Разглядаючы “прымусовую працу жыхароў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў святле новых гістарыяграфічных фактаў”, У.В. Здановіч аналізуе новыя навуковыя працы аб выкарыстанні германскімі акупантамі мясцовага насельніцтва ў якасці працоўнай сілы. Важным у гэтым плане з’яўляецца даследаванне “Вяртанне ў рабства. Прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг.”, выкананае беларускімі гісторыкамі (А.М. Літвіным, Я.А. Грэбенем і С.Я. Новікавым). Дзякуючы праведзенаму даследаванню ў айчыннай гістарыяграфіі ўпершыню названа агульная лічба жыхароў Беларусі, прыцягнутых да працы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Між тым І.В. Здановіч прыходзіць да высновы аб важнасці далейшага вывучэння гісторыі беларускіх гастарбайтараў у ваеннай эканоміцы Германіі.

Прадстаўляючы ўласныя вынікі вывучэння гісторыі Трасцянецкага лагера смерці, І.М. Кузняцоў вызначыў некалькі актуальных праблем з мэтай правядзення далейшага даследавання гэтай праблематыкі. Па перакананні даследчыка, яно не прынясе доўгачаканых вынікаў, калі гісторыкам не ўдасца ўвесці ў навуковы зварот дадатковыя дакументальныя крыніцы, на аснове якіх выйсці на новую якасць гістарычных ведаў у дачыненні да гэтай пакуль недастаткова вывучанай праблемы. У залежнасці ад гэтага можна будзе весці канкрэтную размову аб канцэпцыі будучай экспазіцыі па ўвекавечанні памяці аб маштабнай трагедыі ў Беларусі ў гады германскай акупацыі 1941–1944 гг.

У такім жа ключы Я.І. Бараноўскі падышоў да пытання аб сувязях Мінскага антыфашысцкага падполля з партызанскімі і падпольнымі фарміраваннямі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На думку даследчыка, гісторыя Мінскага падполля першага перыяду яго дзейнасці з’яўлялася не толькі гераічнай, але і трагічнай: апошняе істотна паўплывала на ход навуковай рэканструкцыі гісторыі падпольнай барацьбы ў Мінску. Толькі ў 1990 г. удалося канчаткова зняць абвінавачанні ў дачыненні да І.К. Кавалёва як кіраўніка нелегальнай арганізацыйнай структуры і рэабілітаваць яго як арганізатара і кіраўніка Мінскага антыфашысцкага падполля.

Да ліку маладаследаваных Я.А. Грэбень аднёс заявы і просьбы насельніцтва да калабаранцкай адміністрацыі ў гады германскай акупацыі Беларусі, вывучаючы праз падобныя звароты гісторыю паўсядзённасці і надаючы ім важнае значэнне як каштоўнай крыніцы для рэканструкцыі стратэгій выжывання насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Як паказваюць дакументы, не прымаючы акупацыйны рэжым, значная частка грамадзян была вымушана кантактаваць з новай уладай у паўсядзённым жыцці, асабліва ў сферы сацыяльнай палітыкі.

Заключным на пасяджэнні прагучаў даклад М.В. Стральца на тэму “Імперскае міністэрства замежных спраў нацысцкай Германіі і Халакост”, у якім даследчык прыйшоў да высновы аб падтрымцы структурнымі падраздзяленнямі германскай дзяржаўнай установы радыкальнай “яўрэйскай палітыкі” нацысцкай Германіі.

У паведамленнях, заслуханых у адпаведнасці з праграмай правядзення другога пленарнага пасяджэння, закраналіся іншыя старонкі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якія датычыліся наступнай тэматыкі: "Марцін Борман на тэрыторыі Беларусі і Украіны ў 1942–1943 гг." (Э.Р. Іофе), "Выбух у Асіповічах 1943 г.: міфы і праўда" (А.Г. Зельскі), "Франтавыя дарогі ваеннага карэспандэнта газеты "Правда" Пятра Лідава (па старонках дзённікаў і публікацый 1941–1944 гг.), "Прадстаўніцтва БШПР на 1-м Прыбалтыйскім фронце: стварэнне, асноўныя напрамкі дзейнасці" (Д.А. Козел), "Дзеці – удзельнікі партызанскага і падпольнага руху" (В.Я. Бездзель), "Узрастанне партызанскага руху ў перыяд вызвалення Беларусі: аналіз становішча ў сельскай гаспадарцы на акупаванай заходнебеларускай тэрыторыі праз агляд нацысцкіх дакументаў (верасень 1943 – ліпень 1944 гг.)" (С.Л. Казлова), "Старонкі гісторыі чыгуначных дарог Беларусі: лета 1941 г." (А.У. Кузняцова-Ціманава), "Калі заўтра вайна…": мілітарызацыя масавай свядомасці і паўсядзённага жыцця савецкага насельніцтва напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны" (В.В. Брыгадзіна), "Аплата медыцынскай дапамогі на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)" (Я.М. Цішчанка, С.А. Сіткевіч), "Дзятлаўскі раён у гады нямецка-фашысцкай акупацыі 1941–1944 гг." (Г.С. Хадасевіч), "Дыверсійная дзейнасць партызан у кастрычніку 1943 г. у святле калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі "Мінск" (А.Г. Цымбал), "Нацысцкія фінансавыя планы па ваенна-эканамічным выкарыстанні тэрыторыі Беларусі" (І.Я. Куракова), "Арганізацыя сістэмы ваеннага палону на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)" (А.М. Дакунова), "Дзіцячыя дамы на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь у гады нямецкай акупацыі (1941–1944 гг.)" (І.А. Валынкін), "Дакументы БШПР па развіцці партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі зімой 1942 – летам 1943 гг. як крыніца па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны" (С.В. Кулінок), "Палітыка грамадзянскай акупацыйнай адміністрацыі ў адносінах да непрацаздольных асоб у Беларусі (1941–1944 гг.)" (В.М. Матох), "Сакрэт брыгады "Беларусь" і амерыканская гістарыяграфія" (Я.П. Бязлепкін), "Аперацыя "Марс" у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі" (У.У. Куніцкі, Ф.А. Шумскі), "Дакументы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці аб народных настроях і партыйных рашэннях напярэдадні 22 чэрвеня 1941 г." (Г.М. Якаўлева), "Да пытання аб падаткаабкладанні на акупаванай тэрыторыі Гомельшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944 гг.) " (Л.С. Скрабіна).

У час правядзення трэцяга пленарнага пасяджэння "Беларусь як аб'ект новых даследчыцкіх пошукаў і знаходак" былі заслуханы і абмеркаваны даклады, у якіх аўтары прапаноўвалі ўласныя трактоўкі гістарычных падзей і фактаў, абгрунтаваннем чаго з'яўляюцца дакументальныя крыніцы. Звернемся да некаторых з іх. Першы даклад, прысвечаны тэме "Савецка-германскія гандлёва-эканамічныя сувязі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны (жнівень 1939 – чэрвень 1941 гг.)", падрыхтаваны ў сааўтарстве гісторыкамі І.А. Літвіноўскім і Ю.І. Літвіноўскай (Мінск). Аўтары прыходзяць да высновы, што гандлёвыя адносіны з Германіяй з'яўляліся для СССР

у той час практычна безальтэрнатыўнай справай. Немцам удалося зрабіць эканамічныя адносіны з Савецкім Саюзам часткай сваёй палітыкі зману з мэтай схаваць прыгатаванні да нападзення і нават атрымаць значную эканамічную выгаду.

У матэрыяле на тэму "Беларускі друк і перыёдыка Германіі: да гісторыі станаўлення эміграцыі" А.С. Ляднёва (Мінск) дае замалёўку агульнага палажэння інфармацыйнага забеспячэння і прыходзіць да думкі аб тым, што эміграцыя як культурная цэласнасць не ў стане жыць і дзейнічаць у замежжы без сваёй нацыянальнай прэсы і друку, якія нясуць у народ адпаведныя ідэі, вызначаюць людскі светапогляд і служаць справе нацыянальнага самавызначэння беларускай эміграцыі.

У.М. Якубоўскі (Мінск) у сваім дакладзе працягнуў разважанні вакол сцяга Перамогі, раскрываючы яго тайны на прыкладзе расшыфроўкі статыстычнай лічбы, якая вынікае з перапісу насельніцтва ў 1939 г., калі агульная колькасць насельніцтва складала 170 557 чалавек. Апроч таго, не менш важным элементам гісторык лічыць надпіс "150-я дывізія", за нумарам якой неабходна бачыць агульную лічбу насельніцтва СССР пасля Вялікай Айчыннай вайны.

У дакладзе "Першая сусветная вайна і развіццё беларускай нацыянальнай культуры" М.Б. Шчаўлінскі спыняецца на асобных падзеях, якія паказваюць асноўныя вынікі развіцця культуры беларускага народа ў гады вайны. Аўтар пры гэтым прыходзіць ды высновы аб тым, што развіццё перыёдыкі, кнігадрукавання, навукова-педагагічнай справы, тэатральнай самадзейнасці, нацыяналізацыі беларускіх школ сведчыць пра важны момант у самавызначэнні асноўнай часткі беларускага грамадства і нацыянальна-дэмакратычнай інтэлігенцыі, у шэрагах якіх усё больш панавала разуменне неабходнасці "людзьмі звацца".

Р.Р. Хісамутдзінава (Арэнбург, Расія) упершыню прадставіла матэрыялы аб ролі Паўднёвага Урала ў пасляваенным аднаўленні разбуранай вайной Беларусі, раскрываючы не толькі значэнне Арэнбургскай (на той час Чкалаўскай вобласці) для эвакуацыі шэрага прамысловых прадпрыемстваў і навукова-даследчых устаноў з БССР. На думку даследчыцы, якая пацверджана мясцовымі дакументальнымі матэрыяламі, далёкая Чкалаўская вобласць РСФСР выратавала шматлікія навуковыя ўстановы, архівы Беларусі, але самае галоўнае – пераўтварылася для многіх эвакуіраваных у малую радзіму, якая дапамагла перажыць ім цяжкія ваенныя гады ўдалечыні ад родных мясцін, выратавала многім жыццё.

У паведамленнях, заслуханых падчас трэцяга пленарнага пасяджэння, даследчыкі аналізуюць розныя аспекты гісторыі, палітыкі, эканомікі, культуры і г.д.: "Германізмы ў ваенным тэзаўрусе беларускай гісторыі" (В.М. Галай), "Выкарыстанне металаканструкцый пры аднаўленні прадпрыемстваў прамысловасці БССР у рамках рэпарацый з Германіі (1945 – пачатак 1950-х гг." (П.А. Канцавы), "Нямецкія ўплывы ў абарончым дойлідстве Беларусі: бергфрыды" (А.М. Кушнярэвіч), "Савецка-фінляндская вайна

ў беларускім Лепелі” (В.А. Латышава), “Вялікая Айчынная вайна і гуманізм у літаратуры” (В.Я. Лагавік), “Кнігі “памяць” пра пасляваеннае аднаўленне гарадоў БССР (крыніцазнаўчы аспект)” (У.П. Мароз), “Змяшчэнне М.М. Літвінава В.М. Молатавым на пасадзе наркама замежных спраў СССР у 1939 г.: новая старонка германа-савецкіх адносін” (М.А. Мігун), “Аб некаторых тэарэтычных аспектах паходжання Другой сусветнай вайны (з нагоды кнігі нямецкага гісторыка Э.Нольтэ “Еўрапейская грамадзянская вайна (1917–1945 гг.)” (А.М. Рэзнік), “Да пытання аб мабілізацыі ў беларускіх губернях у пачатку Першай сусветнай вайны” (М.М. Смальянінаў), “Вольны горад Данцыг у адносінах Германіі і Польшчы пасля заканчэння Першай сусветнай вайны” (Н.Л. Улейчык), “Гданьск у адносінах Германіі і Польшчы напярэдадні Другой сусветнай вайны” (Н.А. Царук), “Некаторыя праблемы айчыннай гістарыяграфіі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны” (А.А. Цобкала), “Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны” (Л.Л. Шкуцько і С.П. Кубека), “Беларусы ў руху Супраціўлення Італіі” (В.П. Паўлаў).

У заключэнне былі падведзены вынікі працы канферэнцыі, выказана адметная думка аб тым, што навуковае абмеркаванне гістарычнага феномена Вялікай Айчыннай вайны і звязанай з ёй даследчыцкай праблематыкі ў фармаце штогадовай канферэнцыі стала добрай традыцыяй для айчынных і замежных гісторыкаў. Месцам такіх сустрэч і надалей бачыцца Цэнтр беларускай мовы і культуры МДЛУ, дзе створана ўтульная і добразычлівая атмасфера, без чаго немагчыма разлічваць на творчы навуковы пошук. Актыўнае супрацоўніцтва гісторыкаў у фармаце такіх сустрэч – трывалы падмурак для правядзення наступных канферэнцый. Добрай прыкметай яе выніковасці з’яўляецца штогадовае выданне зборніка матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць”.

*Поступила в редакцию 12.02.13*